Источник: "Беларусь" - №5, 2014-05-25



# Уладзімір Макей: "Беларусь у ЮНЕСКА: нацыянальнае развіццё і глабальны свет праз гуманізм, культуру і адукацыю"



БЕЛТА

Беларусь 12 мая 2014 года адсвяткавала 60-годдзе членства ў ЮНЕСКА — Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры. Да гэтай важнай падзеі распрацавана шырокая праграма мерапрыемстваў, якія на працягу года будуць праводзіцца ў краіне, у тым ліку Нацыянальнай камісіяй па справах ЮНЕСКА. Да юбілейнай даты быў прымеркаваны і афіцыйны візіт у Мінск генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Ірыны Бокавай, які адбыўся 17—20 красавіка. Старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА расказваў аб вытоках членства ў ЮНЕСКА, аб важнейшых напрамках супрацоўніцтва з гэтай арганізацыяй, а таксама аб інтарэсе сусветнай супольнасці да Мірскага замка і Нясвіжа, да беларускіх абрадаў.

***— Уладзімір Уладзіміравіч, у 2010 годзе ЮНЕСКА адзначыла 65-гадовы юбілей. З якой мэтай стваралася арганізацыя і якіх вынікаў удалося дасягнуць за гэты перыяд?***

— ЮНЕСКА, як і Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, узнікла ў 1945 годзе пасля Другой сусветнай вайны, жахі якой падштурхнулі чалавецтва да пошуку шляхоў устанаўлення сапраўднай культуры міру. "Думкі аб вайне ўзнікаюць у розумах людзей, таму ў свядомасці людзей трэба ўкараняць ідэю абароны міру" — гэтымі словамі пачынаецца Статут ЮНЕСКА, і яны вызначаюць асноўную мэту дзейнасці арганізацыі, якая праз супрацоўніцтва ў галінах адукацыі, навукі і культуры садзейнічае ўмацаванню міру і бяспекі.

За час свайго існавання ЮНЕСКА зрабіла шмат. Яна ўнесла важкі ўклад у барацьбу з расавай дыскрымінацыяй. Пад эгідай ЮНЕСКА група навукоўцаў з розных краін свету прадставіла доказы, якія развянчалі псеўданавуковую аснову, што апраўдвала расавую дыскрымінацыю. Слова "раса" набыло іншы кантэкст. Вынікі работы навукоўцаў таксама леглі ў аснову Канвенцыі аб барацьбе з дыскрымінацыяй у галіне адукацыі, прынятай генеральнай канферэнцыяй ЮНЕСКА ў 1960 годзе, якая застаецца актуальнай да гэтага часу.

Адукацыя заўсёды была ў цэнтры дзейнасці ЮНЕСКА, дзякуючы яе намаганням міжнародная супольнасць прызнала, што без якаснай і даступнай адукацыі для ўсіх немагчыма пераадолець беднасць, голад і хваробы. Статыстыка сведчыць, што і ў нашы дні 16 працэнтаў дарослага насельніцтва (каля 776 мільёнаў чалавек) з'яўляецца неадукаваным, 75 мільёнаў дзяцей застаюцца без пачатковай адукацыі. У сувязі з гэтым Афрыка і гендарная роўнасць прадаўжаюць заставацца глабальнымі прыярытэтамі ЮНЕСКА. Спецыялісты арганізацыі садзейнічаюць бедным краінам у распрацоўцы і правядзенні палітыкі ў галіне адукацыі, распаўсюджваюць прыклады перадавой практыкі і навучальныя матэрыялы, дапамагаюць развіццю праграм тэхнічнай і прафесійнай адукацыі.

ЮНЕСКА — адзіная глабальная арганізацыя, якая займаецца міжнародным супрацоўніцтвам у галіне культуры. За гады яе дзейнасці сфарміраваны цэлы комплекс нарматыўных дакументаў, накіраваных на захаванне культурнай спадчыны, фарміраванне культуры міру, выхаванне талерантнасці і павагі да розных форм культурнага самавыяўлення. Не думаю, што памылюся, выказаўшы меркаванне, што ўсе дзяржавы — члены ЮНЕСКА арыентуюцца на гэтыя дагаворы пры выбудоўванні сваіх дзяржаўных палітык у галіне культуры.

Для абароны вынікаў творчай дзейнасці чалавека ў 1952 годзе ў ЮНЕСКА была прынята Сусветная канвенцыя аб аўтарскім праве, якая ўвяла ва ўжытак усім вядомы сёння знак аўтарскага права © і заклала аснову міжнароднай сістэмы аховы інтэлектуальнай уласнасці.

ЮНЕСКА адна з першых падняла трывогу ў сувязі з бескантрольнай эксплуатацыяй прыродных рэсурсаў. У



Аліна Грышкевіч. Беларусь у ЮНЕСКА: нацыянальнае развіццё і глабальны свет праз гуманізм, культуру і адукацыю

Источник: "Беларусь" - №5, 2014-05-25

1968 годзе пад эгідай ЮНЕСКА прайшла міжнародная канферэнцыя, якая паставіла гэту праблему ў парадак дня міжнароднага супрацоўніцтва. У арганізацыі створаны і дзейнічае шэраг міжнародных навуковых праграм па паляпшэнні ацэнкі рэсурсаў Зямлі і кіравання імі.

Гэта толькі некаторыя вынікі работы. Пастунова арганізацыя стала лабараторыяй ідэй, нарматворчым форумам, цэнтрам для абмену інфармацыяй і каталізатарам шырокага міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва. Лепшым пацвярджэннем запатрабаванасці ЮНЕСКА з'яўляецца той факт, што ў арганізацыю ўваходзяць 195 дзяржаў — гэта нават больш, чым у ААН (193 дзяржавы).

***— Беларусь стаяла ля вытокаў заснавання ААН. Чаму беларусы не былі сярод першых членаў ЮНЕСКА?***

— Беларусь стала членам ЮНЕСКА 12 мая 1954 года практычна адначасова з СССР і Украінай. Сваю ролю ў тым, што перагаворы аб уступленні савецкіх рэспублік у ЮНЕСКА зацягнуліся амаль на 10 гадоў, адыграла палітычная канфрантацыя часоў халоднай вайны. Нягледзячы на свой гуманітарны мандат, ЮНЕСКА, як, зрэшты, і многія іншыя арганізацыі сістэмы ААН, была ўключана ў процістаянне двух процілеглых ідэалогій: сацыялістычнай і капіталістычнай. Гэтыя блокі мелі розныя падыходы да вырашэння праблем міжнароднага супрацоўніцтва.

Паказальны той факт, што ў сярэдзіне 80-х гадоў незадаволеныя ўзмацненнем у ЮНЕСКА пазіцый сацыялістычных і шэрага краін, якія сталі на шлях развіцця, ЗША і Вялікабрытанія выйшлі з арганізацыі. Мінула нямала гадоў, перш чым яны ў 2003 годзе аднавілі сваё членства.

***— Якая роля Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА?***

— Статутам ЮНЕСКА прадугледжана стварэнне ў дзяржавах-членах нацыянальных камісій па справах ЮНЕСКА, якія прызначаны арганізоўваць унутры краін узаемадзеянне ўсіх зацікаўленых у супрацоўніцтве па напрамках дзейнасці арганізацыі. У склад нацыянальных камісій рашэннем урада ўключаюцца прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў адукацыі, навукі, культуры, няўрадавых арганізацый, навуковыя і культурныя дзеячы. Асноўная задача гэтага органа — прыцягваць інтэлектуальны і навуковы патэнцыял дзяржавы для выканання галоўнай місіі ЮНЕСКА — умацавання міру і бяспекі шляхам пашырэння супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі і культуры.

Першая Камісія Беларусі па справах ЮНЕСКА была створана ў 1956 годзе ў адпаведнасці з рашэннем Савета Міністраў БССР. Нацыянальная камісія садзейнічае рэалізацыі праектаў ЮНЕСКА ў краіне, прыцягвае беларускія дзяржаўныя ўстановы і няўрадавыя арганізацыі да ўдзелу ў праграмах арганізацыі, дапамагае ўстанаўліваць кантакты ўнутры краіны і з замежнымі партнёрамі праз супрацоўніцтва з нацыянальнымі камісіямі па справах ЮНЕСКА іншых краін.

Напрыклад, у 2014 годзе ў супрацоўніцтве з нацыянальнымі камісіямі Расіі і Японіі наша камісія і беларуская навуковая і адукацыйная супольнасць адзначалі 200-годдзе з дня нараджэння Іосіфа Гашкевіча, дыпламата, усходазнаўца, вельмі таленавітай асобы. Гэты юбілей ураджэнца беларускай зямлі ўключаны ў Спіс памятных дат ЮНЕСКА.

У наступным годзе грамадскасць шэрага краін разам з Беларуссю будзе святкаваць 250-годдзе з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага. Нацыянальныя камісіі Беларусі, Літвы і Польшчы працуюць сумесна, каб гэты юбілей атрымаў належны рэзананс.

Дарэчы, у канцы мінулага года Нацыянальная камісія Беларусі прыняла рашэнне аб структурыраванні сваёй дзейнасці і стварыла тэматычныя камітэты па асноўных напрамках дзейнасці ЮНЕСКА. Сёння ў камісіі дзейнічаюць камітэты па пытаннях адукацыі, культуры, інфармацыі, навукі і прыродазнаўча-навуковай адукацыі, моладзі і клубаў ЮНЕСКА. Мы разлічваем, што дзейнасць камітэтаў дасць магчымасць яшчэ больш пашырыць магчымасці ў рабоце з насельніцтвам. Усе члены камісіі адкрыты да супрацоўніцтва з кожным, хто зацікаўлены падтрымліваць каштоўнасці ЮНЕСКА і пашыраць уклад Беларусі ў дзейнасць гэтай арганізацыі.

***— Раскажыце аб найбольш паказальных прыкладах супрацоўніцтва Беларусі з ЮНЕСКА.***

— Адзначу, што плённае і практычнае супрацоўніцтва мела месца на працягу ўсяго членства Беларусі ў ЮНЕСКА.

Не ўсе ведаюць, што ЮНЕСКА была першай міжнароднай арганізацыяй, якая пачала аказваць Беларусі міжнародную тэхнічную дапамогу ў галіне мінімізацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Па лініі ЮНЕСКА ў нашай краіне быў рэалізаваны шэраг праектаў па гэтай праблеме. Яны не толькі прыцягнулі ўвагу міжнароднай супольнасці да праблем, з якімі сутыкнулася Беларусь, але і аказалі рэальную дапамогу ў іх вырашэнні. Былі створаны тры цэнтры сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі для пацярпелых ад катастрофы і перасяленцаў, распрацаваны спецыяльныя праграмы для навучання школьнікаў у забруджаных зонах, праграма захавання і дэзактывацыі дзяржаўных архіваў з раёнаў, што пацярпелі. Для сельскай гаспадаркі практычнае значэнне мелі дадзеныя аб перамяшчэнні радыеактыўных часціц па тэрыторыі краіны, адсочванне якіх праводзіцца праз створаную Чарнобыльскую даследчую экалагічную сетку.

Цікавы і той факт, што ў 1983 годзе менавіта ў Беларусі прайшоў першы Сусветны кангрэс па біясферных запаведніках па Праграме ЮНЕСКА "Чалавек і біясфера" ў сувязі з прызнаннем укладу нашай краіны ў стварэнне і развіццё гэтай праграмы.

Ужо ў 80-я гады беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы распрацоўвалі вучэбна-метадычныя матэрыялы наконт ролі біясферных запаведнікаў у адукацыі аб ахове навакольнага асяроддзя для школьнікаў. Гэта работа праводзілася на прыкладах Бярэзінскага біясфернага запаведніка і Белавежскай пушчы. Беларускія спецыялісты рыхтавалі навуковыя даследаванні па экалагічных праблемах і экалагічным планаванні развіцця беларускіх гарадоў, размешчаных на рэках. Навукоўцы Акадэміі навук БССР разам з экспертамі ЮНЕСКА вывучалі змяненне расліннасці Беларусі пад уплывам дзейнасці людзей і ступень уздзеяння чалавека на натуральныя працэсы ў біясферы. У час гэтага супрацоўніцтва беларускія навукоўцы стварылі Чырвоную кнігу па рэдкіх і знікаючых відах жывёл і раслін.

У нашы дні праграма "Чалавек і біясфера" — адна з лідзіруючых у ЮНЕСКА. Сёння яе мэтай з'яўляецца ўстанаўленне аптымальных узае-

стар. 14



Аліна Грышкевіч. Беларусь у ЮНЕСКА: нацыянальнае развіццё і глабальны свет праз гуманізм, культуру і адукацыю

Источник: "Беларусь" - №5, 2014-05-25



стар. 13 маадносінаў паміж чалавекам і прыродай, і Беларусь прадаўжае заставацца яе актыўным членам. Беларусь выбрана на перыяд з 2011 па 2015 год у склад Міжнароднага каардынацыйнага савета праграмы "Чалавек і біясфера". Гэты орган кіруе Сусветнай сеткай біясферных рэзерватаў, якая ўключае 621 аб'ект у 117 краінах.

Хачу асабліва адзначыць той факт, што ў нашай краіне тры прыродаахоўныя тэрыторыі маюць статус міжнароднага біясфернага рэзервата і ўваходзяць у Сусветную сетку: Белавежская пушча, якая адначасова прызнана аб'ектам Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА; Бярэзінскі біясферны рэзерват; а таксама трансгранічны рэзерват "Заходняе Палессе" — унікальны сумесны аб'ект з Польшчай і Украінай. Дарэчы, трансгранічных рэзерватаў усяго 12 у свеце.

Прызнанне прыродаахоўных тэрыторый Беларусі ў якасці міжнародных біясферных рэзерватаў сведчыць аб тым, што наша краіна рухаецца ў правільным напрамку для дасягнення гарманічнага суседства чалавека і прыроды.

**У нашай краіне тры прыродаахоўныя тэрыторыі маюць статус міжнароднага біясфернага рэзервата і ўваходзяць у Сусветную сетку: Белавежская пушча, якая адначасова прызнана аб'ектам Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА; Бярэзінскі біясферны рэзерват; а таксама трансгранічны рэзерват "Заходняе Палессе" — унікальны сумесны аб'ект з Польшчай і Украінай. Дарэчы, трансгранічных рэзерватаў усяго 12 у свеце**

У сферы гуманітарных і сацыяльных навук Беларусь актыўна ўдзельнічае ў рабоце Праграмы ЮНЕСКА па біяэтыцы, заснаванай у 1993 годзе. З 2006 года пры Міністэрстве аховы здароўя створаны Нацыянальны біяэтычны камітэт, які ў супрацоўніцтве з Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэтам імя А. Д. Сахарава і дзеючай на яго базе кафедры ЮНЕСКА навук аб навакольным асяроддзі і менеджменту актыўна займаецца пытаннямі біяэтычнага выхавання дзяцей і моладзі.

На мой погляд, адпавядаць этычным прынцыпам павінны не толькі біялогія і медыцына, але і ўся навука ў цэлым не павінна супярэчыць маральным асновам. ЮНЕСКА — міжнародная пляцоўка для абмеркавання этычных аспектаў у галінах экалогіі, змянення клімату, прымянення нанатэхналогій. У лістападзе 2013 года 37-я сесія генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА прыняла рашэнне аб правядзенні даследавання адносна этыкі ў інтэрнэце. Арганізацыя не застаецца ўбаку ад сапраўды актуальных праблем сучаснасці. А эксперты Беларусі прымаюць актыўны ўдзел у абмеркаванні і выпрацоўцы падыходаў да вырашэння такіх праблем.

***— Як Беларусь узаемадзейнічае з ЮНЕСКА ў сферы адукацыі?***

— Па гэтым напрамку ў нас набыты вялікі досвед. Можна пералічыць значны спіс сумесных мерапрыемстваў з ЮНЕСКА, якія далі магчымасць беларускім спецыялістам азнаёміцца з лепшай сусветнай практыкай у галіне адукацыі. У тым ліку дзякуючы ўзаемадзеянню з ЮНЕСКА Беларусь разам з Германіяй і Кітаем з'яўляецца адным з лідараў у галіне прафесійна-тэхнічнай адукацыі і падрыхтоўкі. Спецыялісты ЮНЕСКА пацвердзілі правільнасць выбранага ў нашай краіне курсу на падтрымку ўстаноў прафтэхадукацыі, чым дапамаглі нам захаваць і развіць гэту важную адукацыйную дзейнасць. Сёння ўсе эканамічна развітыя краіны прызнаюць, што эфектыўная прафесійна-тэхнічная адукацыя з'яўляецца важным элементам эканамічнага росту і забеспячэння занятасці. У красавіку 2013 года ў Мінску прайшла прадстаўнічая міжнародная канферэнцыя "Прафесійная адукацыя ва ўмовах глабальных выклікаў", якая сабрала педагогаў і навукоўцаў з усяго свету для выпрацоўкі рэкамендацый па далейшым развіцці гэтай галіны адукацыі.

Яшчэ адна сфера супрацоўніцтва — выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у адукацыі. Асноўным партнёрам беларускіх устаноў у гэтым пытанні з'яўляецца Інстытут ЮНЕСКА па інфармацыйных тэхналогіях у адукацыі (ІІТА), які знаходзіцца ў Маскве. Беларускія школы, у прыватнасці асацыяваныя школы ЮНЕСКА, якіх у Беларусі больш за 10, і іх колькасць павялічваецца, удзельнічаюць у праекце ІІТА "Разумная школа будучыні". Праект дае магчымасць на практыцы работы школ у іншых краінах азнаёміцца з падыходамі да арганізацыі адукацыйнага працэсу з выкарыстаннем найноўшых інфармацыйных тэхналогій.

ЮНЕСКА асаблівую ўвагу надае інклюзіўнай адукацыі, гэта значыць адукацыі для ўсіх. Для нашай краіны гэта тэма таксама вельмі актуальная. Выбудоўваюцца падыходы ў адукацыйнай сістэме адносна дзяцей з інваліднасцю, ствараюцца ўмовы для атрымання такімі дзецьмі паўнацэннай і якаснай адукацыі. Па лініі супрацоўніцтва з ЮНЕСКА ў Беларусі быў рэалізаваны праект па стварэнні спецыяльнай камп'ютарнай праграмы, прызначанай для агучвання тэкставых дакументаў. Дзякуючы гэтай праграме людзі з парушэннем зроку могуць азнаёміцца з электроннымі тэкстамі на беларускай, рускай і англійскай мовах. Гэта значна пашырае магчымасці дзяцей са слабым зрокам у працэсе навучання. Падрыхтавана ўжо электронная калекцыя твораў школьнай праграмы па беларускай літаратуры для 9-11 класаў.

Развіта ў Беларусі сетка УНІТВІН — кафедры ЮНЕСКА, якая садзейнічае ўмацаванню супрацоўніцтва паміж ВНУ па ўсім свеце і, адпаведна, развіццю навукі. У Беларусі дзейнічаюць сем кафедраў ЮНЕСКА па такіх актуальных тэмах, як аднаўляльныя крыніцы энергіі, інфармацыйныя тэхналогіі і права, навакольнае асяроддзе і прыродазнаўча-навуковая адукацыя, культура свету, талерантнасць, правы чалавека і дэмакратыя. Ствараецца кафедра прафесійнай адукацыі ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для людзей з асаблівымі патрэбнасцямі.



Аліна Грышкевіч. Беларусь у ЮНЕСКА: нацыянальнае развіццё і глабальны свет праз гуманізм, культуру і адукацыю

Источник: "Беларусь" - №5, 2014-05-25

UNESCO

***— Наколькі плённае супрацоўніцтва Беларусі з ЮНЕСКА ў галіне культуры?***

— Супрацоўніцтва ў пытаннях культуры мэтанакіравана развівалася на ўсім працягу членства Беларусі ў арганізацыі. Яшчэ ў 70-я гады Беларусь узнімала ў ЮНЕСКА пытанне важнасці вывучэння славянскіх культур ва ўсім свеце. Славянская тэма атрымала міжнароднае гучанне праз публікацыі ЮНЕСКА: падрыхтаваная беларускімі навукоўцамі манаграфія пра Францыска Скарыну была выдадзена на англійскай і французскай мовах у серыі "Выдатныя дзеячы славянскіх культур". Беларускія этнографы і мастацтвазнаўцы прымалі ўдзел у падрыхтоўцы альбома "Драўляная архітэктура і скульптура славянскіх народаў".

У 1983 годзе на англійскай і французкай мовах выйшла "Анталогія беларускай паэзіі". У 1982 годзе ў Мінску праходзіла навуковая канферэнцыя "Славянскія культуры і сусветны культурны працэс", у якой удзельнічала больш як 200 навукоўцаў з 23 краін.

І сёння Беларусь з'яўляецца актыўнай удзельніцай міжнароднага супрацоўніцтва славістаў. У жніўні 2013 года Мінск прымаў 25-ы Міжнародны з'езд славістаў, які сабраў больш як 600 удзельнікаў з 35 краін свету. Ірына Бокава накіравала сваё пасланне мінскаму з'езду.

У Спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ўключаны чатыры беларускія аб'екты. Першы з іх — у 1992 годзе. Беларуская частка ўнікальнага ляснога масіву Белавежскай пушчы атрымала гэты прэстыжны статус, далучыўшыся да польскай часткі, якая была ўключана ў спіс у 1979 годзе. Беларусь і Польшча сумесна ўнеслі прапанову аб пашырэнні тэрыторыі аб'екта сусветнай спадчыны "Белавежская пушча". Гэта сведчыць, што мы паспяхова спраўляемся з задачай захавання ў першапачатковым выглядзе гэтага старажытнага ляснога масіву Еўропы. Яшчэ адзін трансгранічны аб'ект сусветнай спадчыны — "Геадэзічная дуга Струвэ" — сетка апорных геадэзічных пунктаў назірання, якая была закладзена яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя і знаходзіцца на тэрыторыі 10 краін — ад Нарвегіі да Чорнага мора ва Украіне. У 2000 і 2005 гадах у спіс былі ўключаны культурныя аб'екты "Комплекс Мірскага замка" і "Архітэктурны, жылы і культурны комплекс роду Радзівілаў у Нясвіжы".

Атрыманне статусу аб'екта сусветнай спадчыны — гэта перш за ўсё прызнанне яго выключнасці і значнасці для ўсяго чалавецтва. Эксперты дасканала вывучаюць прапановы дзяржаў, і далёка не ўсе яны атрымліваюць падтрымку. Уключыўшы аб'ект у Спіс Сусветнай спадчыны, дзяржава і ўсе яе грамадзяне бяруць на сябе абавязацельства захоўваць яго для будучых пакаленняў. Пры гэтым захаванне не азначае кансервацыю і ахову ад публікі, захаванне — гэта разумнае і беражлівае выкарыстанне, перш за ўсё прадастаўленне магчымасці знаёміцца са спадчынай, усведамляць яе ролю і значэнне для гісторыі і культуры краіны. Як адзначаюць многія даследчыкі, статус аб'екта сусветнай спадчыны аўтаматычна павялічвае яго наведвальнасць на 30 працэнтаў. Гэта і дадатковыя эканамічныя магчымасці для рэгіёна, дзе размешчаны помнік, але і новыя рызыкі, паколькі нельга дапусціць, каб ён быў сапсаваны і страціў сваю каштоўнасць.

Нягледзячы на ўсе складанасці з пытаннямі захавання спадчыны, гэта дзейнасць застаецца адной з самых запатрабаваных у ЮНЕСКА, і Спіс Сусветнай спадчыны прадаўжае папаўняцца.

***— Некалькі гадоў таму беларускі абрад "Калядныя цары" быў уключаны ў Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА. Раскажыце крыху пра гэта.***

— Абарона нематэрыяльнай спадчыны, гэта значыць нацыянальных культурных традыцый, творчасці і рамёстваў, — тэма не новая для ЮНЕСКА. І хоць міжнародны дагавор у гэтай галіне з'явіўся толькі ў 2003 годзе, ён ужо стаў практычна ўніверсальным, як і Канвенцыя аб Сусветнай спадчыне.

Наша краіна мае ўнікальную нематэрыяльную спадчыну. Тое, што ў 2006 годзе Беларусь далучылася да Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, прынятай у 2003 годзе, дапамагло нам своечасова арганізаваць работу па інвентарызацыі і захаванні гэтай спадчыны. Фонд, які дзейнічае ў рамках гэтай Канвенцыі, выдзеліў сродкі на рэалізацыю праекта па стварэнні нацыянальнага інвентару беларускай нематэрыяльнай спадчыны. З вынікам гэтай работы кожны можа азнаёміцца на сайце www.livingheritage.by.

Беларусь пакуль уключыла адзін элемент у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА — абрад "Калядныя цары" вёскі Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці, але нашы эксперты сумесна з носьбітамі нацыянальных традыцый ужо рыхтуюць прапановы для пашырэння прадстаўленасці нашай краіны ў спісах нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА.

Нельга не згадаць і плённае супрацоўніцтва з ЮНЕСКА ў галіне дакументальнай спадчыны. Дзякуючы гэтаму супрацоўніцтву ў краіну вярнуўся ў электронным выглядзе архіў М. К. Агінскага, праведзена вялікая работа па віртуальнай рэканструкцыі дакументальнай спадчыны Сапегаў, Храптовічаў і Радзівілаў. У бягучым годзе завяршыўся праект па фарміраванні электроннай бібліятэкі Юзэфа Крашэўскага, унікальная спадчына якога ўключана ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Вынікі гэтай дзейнасці даступныя кожнаму ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі і іншых устаноў культуры нашай краіны.

Збор і аднаўленне дакументальнай спадчыны нашых суайчыннікаў маюць важнае значэнне і для міжнароднай супольнасці. Архівы і Нясвіжская бібліятэка Радзівілаў у 2009 годзе па ініцыятыве Беларусі ўключаны ў рэестр ЮНЕСКА "Памяць свету".

***— Якімі вы бачыце перспектывы ўзаемадзеяння нашай краіны з ЮНЕСКА?***

— Сёння ЮНЕСКА — гэта важны партнёр Беларусі ў вырашэнні задач у сацыякультурнай сферы, а таксама ўнікальная платформа для прапаганды дасягненняў у сферах культуры, навукі, адукацыі, інфармацыйных тэхналогій, для папулярызацыі знешнепалітычных ініцыятыў краіны і развіцця ўзаемавыгадных двухбаковых кантактаў.

Інтэлектуальны патэнцыял нашай краіны дае магчымасць нам уносіць важкі ўклад у фарміраванне палітыкі ЮНЕСКА, яе парадку дня, удзельнічаць у распрацоўцы нарматыўных дакументаў, ініцыяваць новыя напрамкі дзейнасці. У нашага супрацоўніцтва вялікія перспектывы, і Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА прадоўжыць прыкладаць усе намаганні для напаўнення гэтага супрацоўніцтва канкрэтнымі і ўзаемавыгаднымі праектамі.

Аліна **Грышкевіч**



Аліна Грышкевіч. Беларусь у ЮНЕСКА: нацыянальнае развіццё і глабальны свет праз гуманізм, культуру і адукацыю